■ Удзельнічайце і перамагайце!

# «Волат беларускага слова»

**Анлайн-віктарына пад такой назвай праводзіцца з нагоды 140-годдзя вядомага беларускага класіка Якуба Коласа.**

3 лістапада 140 гадоў таму нарадзіўся вялікі народны паэт Беларусі Якуб Колас, творчасць якога знаёма кожнаму з дзяцінства.

Супрацоўнікі Цэнтральнай раённай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна прапануюць усім жадаючым прыняць удзел у літаратурнай анлайн-віктарыне, прысвечанай юбілею народнага паэта. Віктарына складаецца з некалькіх заданняў. За ўсе пройдзеныя этапы будуць давацца ключавыя словы, а кожны ўдзельнік, які дашле на электронны адрас бібліятэкі выніковую фразу, атрымае электронны сертыфікат.

Прыняць удзел у віктарыне можна з дапамогай QR-кода альбо на сайце бібліятэкі **mozyrlib.by**.

Тэрмін правядзення: лістапад–снежань.

Месца правядзення: сайт Цэнтральнай раённай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна. Кантактны тэлефон **24-33-85**, Кузоўкіна Аксана Віктараўна.

**Наталля КАНОПЛІЧ.**